# СУЧАСНАЯ **БЕЛАРУСКАЯ** ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА

## МАРФАЛОГІЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА

◆

## МАРФАЛОГІЯ

*Пад агульнай рэдакцыяй*
*прафесара М. С. ЯЎНЕВІЧА*

ДАПУШЧАНА МІНІСТЭРСТВАМ АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У ЯКАСЦІ ВУЧЭБНАГА
ДАПАМОЖНІКА ДЛЯ СТУДЭНТАЎ
ФІЛАЛАГІЧНЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ
ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

УК-574
Беларускі дзяржаўны
педагагічны універсітэт
БІБЛІЯТЭКА

МІНСК
1997

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

УДК 808.26(075.4)
ББК 81.2Беи-9
С 91

Аўтары

Н. В. ГАЎРОШ, М. Ц. КАВАЛЁВА,
Н. М. НЯМКОВІЧ, К. М. ПАНЮЦІЧ,
Т. М. ТРЫПУЦІНА, А. М. ЦЯСЕВІЧ, М. С. ЯЎНЕВІЧ

Рэцэнзенты

кафедра беларускай мовы
Віцебскага дзяржаўнага універсітэта;
кандыдат філалагічных навук,
прафесар *Г. М. МАЛАЖАЙ*

**Сучасная** беларуская літаратурная мова. Марфалогія: Вучэб. дапам. / Н. В. Гаўрош, М. Ц. Кавалёва, Н. М. Нямковіч і інш.; Пад агульн. рэд. праф. М. С. Яўневіча. — Мн.: Выд. Ул. М. Скакун, 1997. — 288 с.

С 91

ISBN 985-6235-12-X

Асвятляюцца пытанні праграмы філалагічных факультэтаў педагагічных інстытутаў і універсітэтаў раздзела «Марфалогія» ў курсе сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Можа быць выкарыстаны студэнтамі іншых факультэтаў, дзе вывучаецца беларуская мова, настаўнікамі.

ISBN 985-6235-12-X ББК 81.2Беи-9

© Калектыў аўтараў, 1997

## АД АЎТАРАЎ

Вучэбны дапаможнік «Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія» створаны ў адпаведнасці з праграмай аднайменнага курса (1995 г.), які фактычна з'яўляецца асноўным сярод лінгвістычных дысцыплін, што вывучаюцца на факультэтах (аддзяленнях) беларускай філалогіі педагагічных універсітэтаў і педагагічных інстытутаў.

Дапаможнік напісаны з улікам дасягненняў сучаснага мовазнаўства. Яго мэта — даць сістэмнае і паслядоўнае асвятленне тэарэтычных пытанняў марфалогіі як граматычнага вучэння аб слове, марфемнай структуры слова і словаўтварэння, часцін мовы як лексіка-граматычных разрадаў слоў. Тэарэтычны матэрыял ілюструецца дастатковай колькасцю моўных фактаў, узятых з лепшых твораў мастацкай літаратуры.

Гэта кніга, падрыхтаваная членамі кафедры беларускага мовазнаўства БДПУ ім М. Танка, не з'яўляецца чарговым выданнем аднайменнага дапаможніка, які прайшоў шматгадовую апрабацыю (выд. 1975, 1980 гг.). Большасць яе раздзелаў напісаны іншымі аўтарамі; раздзелы і параграфы, створаныя тымі самымі аўтарамі, значна перапрацаваныя і дапоўненыя. Унесены частковыя змены ў структуру раздзелаў: зменшылася колькасць параграфаў, з мэтай дапамагчы студэнтам больш трывала засвоіць праграмны матэрыял у канцы кожнага раздзела дадзены кантрольныя пытанні і заданні, а таксама спіс спецыяльнай літаратуры, з якой студэнт павінен пазнаёміцца.

У «Марфалогію» як раздзел граматыкі традыцыйна ўключаны раздзелы «Марфемная структура слова» і «Словаўтварэнне», хоць яны ў апошні час у некаторых дапаможніках выдзяляюцца як самастойныя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Абмежаваны аб'ёмам, дапаможнік не прэтэндуе на вычарпальнае асвятленне ўсіх пытанняў марфалогіі, уключаючы марфемную структуру слова і словаўтварэнне, бо гэта — задача спецыяльных навуковых выданняў і падручніка. Больш шырокія адказы на некаторыя складаныя і дыскусійныя пытанні студэнт знойдзе ў прапанаванай навуковай літаратуры, а таксама ў курсе лекцый выкладчыка, на практычных і лабараторных занятках.

Хоць дапаможнік прызначаны студэнтам-філолагам спецыяльнага факультэта, але, думаецца, ён можа прынесці карысць студэнтам факультэтаў рускай філалогіі, журналістыкі, педагогікі і методыкі пачатковага навучання і інш., дзе беларуская мова вывучаецца ў параўнальна вялікім аб'ёме.

Раздзелы кнігі напісалі: «Марфалогія як граматычнае вучэнне аб слове» (§ 1—3), «Часціны мовы» (§ 12—13), «Прыметнік» (§ 29—35), «Дзеепрыметнік» (§ 78—81), «Мадальныя словы» (§ 110—113) — Н. В. Гаўрош; «Дзеяслоў» (§ 55—74) — М. Ц. Кавалёва; «Дзеяслоў» (§ 75—77), «Безасабова-прэдыкатыўныя словы» (§ 93—94) — Н. М. Крамковіч; «Марфемная структура слова» (§ 4—9), «Дзеепрыслоўе» (§ 82—85), «Часціцы» (§ 104—109) — К. М. Панюціч; «Назоўнік» (§ 14—28), «Прыслоўе» (§ 86—92) — Т. М. Трыпуціна; «Злучнік» (§ 101—103), «Выклічнік» (§ 114—116) — А. М. Цясевіч; «Словаўтварэнне» (§ 10—11), «Лічэбнік» (§ 36—44), «Займеннік» (§ 45—54), «Прыназоўнік» (§ 95—100) — М. С. Яўневіч.

Аўтары выказваюць шчырую падзяку рэцэнзентам — кафедры беларускай мовы Віцебскага дзяржаўнага універсітэта і загадчыку кафедры беларускага мовазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта прафесару Г. М. Малажай за іх заўвагі і парады, накіраваныя на паляпшэнне дапаможніка.

Заўвагі і пажаданні адносна зместу кнігі просьба дасылаць на адрас: 220809, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка, кафедра беларускага мовазнаўства.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ